Козік, Л. А. Планаванне і методыка правядзення самастойнай работы студэнтаў (з вопыта выкладання курса «Навейшая гісторыя заходніх славян») / Л. А. Козік // Организация самостоятельной работы студентов на факультете вуза: Материалы междунар. науч.-прак. конф. Минск, 16–17 ноября 2006 г. / Отв. ред. В. В. Сергеенкова. — Мн.: БГУ, 2006. — С. 107–109

**Л. А. КОЗІК**

**Беларускі дзяржаўны універсітэт**

# ПЛАНАВАННЕ І МЕТОДЫКА ПРАВЯДЗЕННЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ (З ВОПЫТА ВЫКЛАДАННЯ КУРСА «НАВЕЙШАЯ ГІСТОРЫЯ ЗАХОДНІХ СЛАВЯН»)

Важную ролю ў вывучэнні гісторыі адыгрывае арганізацыя самастойнай работы студэнтаў. Правільнае планаванне і вызначэнне задач навучальнага працэса не толькі ў аўдыторыі, але і па-за яе межамі дапамагае паглыбіць



веды, ўдасканаліць уменні будучых даследчыкаў і настаўнікаў, абагульніць і паўтарыць пройдзены матэрыял, выкарыстаць атрыманыя веды і пашырыць іх. Зыходзячы з гэтага роля выкладчыка пры кантралюемай самастойнай рабоце студэнтаў зводзіцца да падбора студэнтам індывідуальных заданняў для выбара, забеспячэння неабходнай літаратурай, акрэслення рацыянальных шляхоў выканання заданняў і правядзення індывідуальных і групавых кансультацый. На наш погляд, найбольш аптымальным у гэтым сэнсе з'яўляецца выкарыстанне рэйтынгавай сістэмы, якая дазваляе спланаваць па-за аўдыторную дзейнасць студэнтаў.

Навейшая гісторыя заходніх славян выкладаецца на трэцім курсе гістарычнага факультэта БДУ для студэнтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці «Гісторыя». Падчас першай сустрэчы навучэнцы знаёмяцца з умовамі рэйтынгавай сістэмы. Яна ўлічвае такія віды дзейнасці як наведванне лекцый і практычных заняткаў, адказы і дапаўненні, падрыхтоўку канспекта і паведамленняў (рэфератаў), напісанне рэцэнзіі на навуковы артыкул і эсэ на тэму «Ці магла Чырвоная армія дапамагчы паўстанцам Варшавы?», выніковы тэст і экзамен. Пры вызначэнні заданняў ставіліся ў першую чаргу адукацыйная і развіваючая задачы з акцэнтам на апошнюю і ўлічвалася аўдыторная і па-за аўдыторная праца студэнтаў.

Самастойную работу студэнтаў неабходна зарыентаваць на пазнавальную дзейнасць з улікам творчых умоў. Так, падрыхтоўка канспекта да практычных заняткаў прадугледжвае працу з першакрыніцамі і навуковымі даследаваннямі. Гэты від дзейнасці спрыяе развіццю ў навучэнцаў умення аналізаваць гістарычны матэрыял, выбіраць галоўнае, рабіць высновы. Каб скіраваць самастойную работу студэнтаў, ім прапаноўваецца схема рэцэнзіі тэкста падручніка, кнігі ці артыкула. Такім чынам адбываецца мэтанакіраваная работа навучэнцаў, правяраецца якасць яе выканання і пры неабходнасці абмяркоўваецца падчас індывідуальных кансультацый.

Іншым відам самастойнай работы з'уляецца пісьмовае рэцэнзіраванне навуковага артыкула. Спіс публікацый прадстаўляецца на першым занятку і студэнты маюць права выбару цікавай ім тэмы. Гэты від дзейнасці спрыяе развіццю ўмення аналізаваць матэрыял, даваць ацэнку пазіцыі аўтара, што вельмі важна для будучых навукоўцаў. У якасці альтэрнатывы артыкулу можна прапанаваць анатацыю/рэцэнзію на манаграфію, але на наш погляд, гэта больш складаны від дзейнасці, які патрабуе шмат часу і пэўных навыкаў.

Адной з задач, якая стаіць перад выкладчыкам пры арганізацыі самастойнай работы студэнтаў-гісторыкаў, з'яўляецца развіццё ўмення аналізаваць першакрыніцы і навуковы матэрыял, параўноўваць розныя падыходы да вызначэння праблем і аргументаваць свой пункт гледжання. З гэтай мэтай пры



вывучэнні курса «Навейшая гісторыя заходніх славян» навучэнцам былі прадстаўлены апублікаваныя матэрыялы (на электронных носьбітах) расійскіх і нямецкіх архіваў, на аснове якіх неабходна напісаць эсэ на тэму «Ці магла Чырвоная армія дапамагчы паўстанцам Варшавы?». Вынік такой формы работы быў у значнай ступені нечаканым. Некаторыя студэнты шчыра прызнавалі, што прааналізаваўшы дакументальны матэрыял, яны мянялі свае ў пэўнай ступені стэрэатыпныя погляды. Такім чынам, можна сцвярджаць, што падчас работы з першакрыніцамі студэнты ўдасканальваюць уменне аналізаваць, параўноўваць розныя погляды і аргументаваць свой пункт гледжання.

Вопыт паказвае, што запланаваная самастойная работа студэнтаў, якая прадугледжвае розныя формы працы і кантроля выканання заданняў, з'яўляецца дзейсным сродкам фарміравання не толькі трывалых ведаў, але і спецыяльных гістарычных уменняў.